Несмотря на явную однобокость этатистского правопонимания, на неоправданный фанатизм государственной политики, неизменно сопровождающий существование этатизма в советском правопонимании, всё-таки нормативная трактовка имела свои плюсы, в частности, именно благодаря этому в СССР были весьма детально изучены многие отрасли права, особенно уголовное и административное, был накоплен громадный нормотворческий опыт. Собственно поэтому даже по прошествии пятнадцати лет большинство правоведов так или иначе не могут из предлагаемых ими определений права исключить некоторые позитивистские элементы.

***І.А. Шумскі***
БДЭУ (Мінск)

## РАЗВІЦЦЕ ІНСТЫТУТА РЭЧАЕВАГА ПРАВА Ў ЗАКАНАДАЎСТВЕ ВКЛ ПРЫВІЛЕЙНАГА ПЕРЫЯДУ

У пачатку XVI ст. з'явілася новае разуменне права і гэта стала перадумовай развіцця агульнадзяржаўнага права. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя змены ў грамадстве патрабавалі павышэння ролі права на ўсёй тэрыторыі дзяржавы. Перыяд XIV — першай паловы XVI ст. можна лічыць пераходнай сцязей ад звычаёвага права да агульнадзяржаўнага кадыфікаванага закону. Разам з тым нормы звычаёвага права ўсе яшчэ мелі істотны грунт, таму мясцовае права пераважае і нават адхіляе агульнае (існуе партыкулярная сістэма права).

Крыніцай прывілеяў заставалася звычаёвае права, але ўжо перапрацаванае. У асноўным граматы (прывілеі) пацвяржалі існуючае самабытнае права, у тым ліку маёмасныя і асабістыя правы жыхароў гэтых зямель. Аб'ектамі рэчавага права Беларусі таго часу былі маёнткі, залежныя людзі, азёры, рэкі і палі, лугі, ворыўныя землі, жывёлы, прадукты сельскай гаспадаркі, розныя пабудовы, іншымі словамі прадметы матэрыяльнага свету, якія служылі ажыццяўленню інтарэсаў пануючых колаў. Склаўся ў той перыяд таксама і падзел рэчаў на рухомыя і нерухомыя, хаця закон нават у болш позні час не праводзіць адметнай адзнакі.

Суб'ектамі грамадзянскага права ў феадальнай дзяржаве лічыліся: феадалы, сама дзяржава, царква, манастыры, гарады, свабодныя гаражане, сялянская грамада і свабодныя сяляне, хаця паступова іх правамоцтвы абмяжоўваліся. Правааздольнасць асобы ўключала такія элементы, як: наяўнасць падданства дзяржавы, стан свабоды, самастойнае становішча ў сям'і. Станаўленне пры-

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

гонніцкіх адносін суправаджалася абмежаваннем правоў селяніна ва ўсіх сферах праваадносін. Аднак, як адзначаюць польскія вучоныя, своеасаблівым суб'ектам права доўгі час заставалася сялянская грамада. Гэта можна растлумачыць дастаткова доўгім ужываннем звычаёвага права. У старажытныя часы суб'ектам права была не фізічная асоба, а род ці абшчына. Пастулова прыватны пачатак ўсё больш выцясняе калектыўнае, і ранейшае распараджэнне маёмасцю пераўтвараецца ў права выкупу адчужанай нерухомасці. Права ўласнасці супадала з жыццевым уяўленнем аб ім, як неабмежаваным і выключным панаваннем над рэччу. Што атрымала юрыдычнае афармленне ў прывілеях, у першую чаргу агульназемскіх. Напрыклад, у прывілеі караля польскага і вялікага князя літоўскага Ягайлы ад 20.02.1387г. даецца разуменне прыватнай маёмасці ў сучасным яго разуменні, як права валодаць, трымаць, карыстацца, прадаваць, адчужаць, абменьваць, даваць, дараваць, паводле добрай волі і думкі замкі, валасці, вёскі і дамы і ўсё, чым уладаў бы па бацькоўскай спадчыне. Развіцце грамадзянскага права адбывалася таксама ў абласных прывілеях дзяржаўнаправавых актах ВКЛ, у якіх замацоўваліся аўтаномныя правы некаторых зямель (княстваў, ваяводстваў, паветаў). Нормы, змешчаныя ў абласных граматах паходзілі, па-першае, з мясцовага звычаёвага права, выпрацаванага ў час, калі многія з гэтых зямель былі самастойнымі дзяржавамі і іх насельніцтва, выбіраючы сабе князя, заключала з ім пагадненне. У ім былі абумоўлены правы і абавязкі як князя, так і народа. Па-другое, з папярэдніх нарматыўных актаў; па-трэцяе, з норм, выпрацаваных адміністрацыяй і судовай практыкай.

Права ўласнасці рэгламентавалася граматамі на магдэбурскае права.

Граматы на магдэбурскае права — заканадаўчыя акты, якія вылучалі насельніцтва горада (мяшчан) з пад улады тэрытарыяльнай мясцовай адміністрацыі. Яны грунтаваліся на ўласным звычаёвым праве. У граматах прама або ўскосна прызнаваліся правы мяшчан валодаць і распараджацца землямі, якія належаць ім. Тым самым мяшчане-землеўладальнікі атрымлівалі такое ж права водолаць зямлей як баяры, шляхта.

Агульная характарыстыка прывілейнага права ў галіне грамадзянскага права дае магчымасць зрабіць выснову аб тым, што ў гэтых заканадаўчых актах існуе разуменне права ўласнасці у яго сучаснай трактоўцы як трыманне, валоданне і карыстанне.

БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by